Дрэсіроўшчык Эдгард ЗАПАШНЫ:

«Буду «хварэць» за беларускіх і расійскіх хакеістаў!»

У беларускую сталіцу з праграмай «Эмоцы і...» завітаў цырк братоў Запашных. Праўда, малодшы з братоў, Аскольд, першыя некалькі тыдняў будзе адсутнічаць на арэне. Цяпер ён знаходзіцца ў Германіі і аднаўляецца пасля аперацыі. Прадстаўляючы новае шоу, старэйшы з братоў Эдгард Запашны расказаў, чым будуць здзіўляць публіку, дзе і як плануюць адпачываць, а таксама паразважаў пра жыццё ў цыркавым мастацтве.

— Адразу хацелася б папрасіць прабачэння ў гледачоў за тое, што будзе адбывацца ў нашай праграме як мінімум два тыдні. У брата цяпер сур'ёзныя праблемы са спінай, і ўрачы забаранілі яму любую фізічную актыўнасць, — патлумачыў Эдгард Запашны. — Але нашы гастролі запланаваны да канца ліпеня, таму, спадзяюся, крыху пазней ён далучыцца да нас на манежы. Усе трукі, якія рабіў брат, я бяру на сябе. У нумарах, дзе ён прысутнічаў, яго часова будуць замяняць дублёры, таму адсутнасць Аскольда не скажацца на якасці і працягласці праграмы.

ПРА НОВЫЯ СЦЕНЫ, ЭМОЦЫІ І ВІДОВІШЧЫ

Запашныя гасцююць у Мінску ўжо не першы раз, але працавалі раней яшчэ ў старым, не адрэстаўраваным будынку цырка. Таму цяпер першымі ўражаннямі былі радасць і захапленне: «Мы прыехалі ў цырк, які смела можна аднесці да дзясятка лепшых у свеце, нават з улікам таго, што крытэрыі ацэнкі могуць быць рознымі. Мы цяпер знаходзімся ў ідэальным цырку з практычна ідэальнымі ўмовамі для працы. Тут абноўленая каманда, кіраўніцтва, якое настроена на стварэнне, са свежым поглядам, эмоцыямі».

Сёння цырк братоў Запашных з'яўляецца самым вялікім калектывам у Расіі. На гастролі ў беларускую сталіцу прыехала каля ста чалавек — лаўрэаты міжнародных цыркавых фестываляў і конкурсаў, майстры спорту міжнароднага класа.

Што да новай праграмы, то ў ёй будзе вялікая колькасць жывёл (сабакі, папугаі, тыгры-альбіносы і белыя львы, адзін з самых маштабных конных нумароў «Элада», акрабатыка, жанглiраванне...) «Усе нашы паветраныя гімнасты працуюць без страхоўкі, — са стрыманым гонарам зазначае Эдгард Запашны. — Будзем выконваць унікальныя нумары. Калі прыедзе мой брат, вернем у праграму скокі на льве, — трук, які занесены ў Кнігу рэкордаў Гінэса. Наогул, большая частка нашых нумароў групавыя, што дастаткова складана ў сучасных рэаліях, але мы прыхільнікі глабальнага цырка і дзякуючы запатрабаванасці ў гледачоў можам паказваць усё ў поўным аб'ёме». Што хаваецца пад гэтым «усё», кожны глядач зможа ўбачыць ужо непасрэдна на прадстаўленні.

Самым складаным жанрам у цыркавым мастацтве, дарэчы, Эдгард Запашны лічыць клаўнаду: «Рассмяшыць у наш час гледача — задача не з лёгкіх. Нават у кінатэатрах глядач усё радзей усміхаецца. Мы ўжо проста не ведаем, з чаго смяяцца... Калі ж казаць пра трукі, то многія з нас рызыкуюць жыццём штодня. Я, напрыклад, засоўваю галаву ў пашчу тыгру. І добра разумею, адчуваючы яго клыкі ў сябе на скроні, што магу проста пагаснуць, як той тэлевізар. Але тыгр дазваляе мне рабіць гэта. А глядач ідзе ў цырк менавіта па эмоцыі, каб убачыць нешта падобнае...»

ПРА ЯКАСЦЬ І КАНКУРЭНЦЫЮ

На фоне сённяшніх шматлікіх цыркавых шоу і забаўляльных праектаў здзіўляць аўдыторыю становіцца ўсё складаней, аднак гэты факт не выклікае насцярожанасці ў маскоўскіх гастралёраў.

«Калі б мы баяліся канкурэнцыі, то проста не прыехалі б сюды. Паўгода таму я прылятаў у Мінск, знаёміўся з цыркам і бачыў вельмі якасную праграму. Таксама сюды прыязджаюць многія сусветна вядомыя артысты, таму публіка ў пэўнай меры распешчана відовішчамі. Мы толькі за канкурэнцыю, бо хочацца, каб павышаўся і наш узровень.

...Я быў на 90 працэнтах спектакляў Цырка дзю Салей, і перш за ўсё — гэта 20 гадоў якасці. За гэты час яны нідзе моцна не спатыкаліся, так, каб быў вельмі слабы спектакль. Яны трымаюць марку. Другі складнік папулярнасці — імідж: гэта першы цырк без жывёл, які заваяваў папулярнасць сярод пэўнага кантынгенту. Падкрэсліваю, сярод пэўнага кантынгенту, а як паказвае вопыт, у Расіі і ў Беларусі гледача цікавяць жывёлы ў цырку. Тыя ж дзеці хутка стамляюцца, калі няма змены карцінкі і эмоцый. Што тычыцца канкурэнтаздольнасці, то я заўсёды раўняўся толькі на лепшых. Нават усведамляючы, што бываюць рэчы з разраду немагчымага, ніколі не пабаюся зрабіць лепшы спектакль, чым у некага. Прыемна, калі пасля спектакляў нас параўноўваюць з Цыркам дзю Салей, бо ён самы іміджавы і багаты, але «раскруціцца» да іх узроўню пакуль не ўдалося ніводнай цыркавой кампаніі — ні ў Расіі, ні на постсавецкай прасторы».

ПРА СЯМЕЙНЫ ТАНДЭМ І ВОЛЬНЫ ЧАС

«Маё самае вялікае шчасце — гэта добрыя адносіны з братам. За 36 гадоў жыцця поплеч перажывалі розныя моманты, але калі выходзіш на манеж, то забываеш пра ўсё. Проста разумееш: побач з табой чалавек, які дзеля цябе гатовы рызыкаваць жыццём. Гэта нас вельмі збліжае. Мы сварымся, можам і пабіцца, але я прывык, што ён заўсёды побач».

Гастрольны графік у артыстаў досыць шчыльны, аднак ёсць і вольныя ад працы дні, якія артысты мяркуюць правесці з карысцю: «У Мінску я далёка не першы раз. У нас будуць выхадныя па панядзелках і аўторках, тады, думаю, зможам выязджаць і глядзець славутыя месцы, з'ездзіць у Мірскі замак. З задавальненнем наведаю заапарк. Мне заўсёды цікава, што там адбываецца. У мінулы раз я займаўся пошукам коней. Верагодна, і цяпер зраблю некалькі такіх паездак. Што наконт экстрыму, то я заўсёды выбіраю для адпачынку тыя месцы, дзе бяспечна. Бо я разумею, што любая рызыка адаб'ецца на працы. Хіба адна мара мяне не пакідае — хачу скочыць з парашутам. Можа, пры добрым надвор'і ўдасца яе сёлета здзейсніць».

Таксама Эдгард прызнаўся, што ў планах у яго — пабываць на гульнях чэмпіянату свету па хакеі-2014 і ад душы падтрымаць каманды беларускіх і расійскіх хакеістаў: «Вельмі шчыльна займаюся тым, каб удалося трапіць на гульні як Расіі, так і Беларусі. На некаторыя гульні мы ўжо дакладна трапім. Спадзяюся, і да нас хакеісты прыйдуць перад матчамі альбо пасля іх, каб крыху развеяцца. Хаця я разумею, што для нашых спартсменаў цяпер на першым месцы барацьба... Але мяркую, што напярэдадні маштабных міжнародных мерапрыемстваў, такіх, напрыклад, як той жа чэмпіянат свету па хакеі, кіраўніцтва краіны павінна быць зацікаўлена ў тым, каб паказваць сваё мастацтва і цырк у першую чаргу. Бо цырк — мастацтва, якое не патрабуе тлумачэння і перакладу».

Алена ДРАПКО.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



	8	9		6	5	4		
4		1	9		3		6	
6	7		4	2				9
		3			9	1		
			5					
				3		8	4	
	3						9	4
		4						
1			6					7

СУДОКУ. *У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клетці, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.*

АДКАЗЫ НА СКАНВОРД + СУДОКУ

Па гарызанталі: Мшара. Дартуга. Эгле. Аброк. Тын. Ўнар. Сніка. Акант. Дет. Сатыр. Аба. Сагала. Кулок. Рабат. Тор. Бэак. Агава. Аноа. Лежок. Юра. Рата. Стаката. Дыпламат.
Па вертыкалі: Дента. Сонца. Моргун. Аўтакрама. Аеэтр. Сарбона. Авано. Абора. Гатака. Ют. Фарсі. Карабкуп. Кэрс. Рукзак. Адаг. Лежок. Авака. Гавот. Контрагента.
СУДОКУ: *адказы — у тэрміны.*

3	8	9	7	6	5	4	2	1
4	2	1	9	8	3	7	6	5
6	7	5	4	2	1	3	8	9
8	4	3	2	7	9	1	5	6
2	1	6	5	4	8	9	7	3
9	5	7	1	3	6	8	4	2
5	3	2	8	1	7	6	9	4
7	6	4	3	9	2	5	1	8
1	9	8	6	5	4	2	3	7

Даты | Падзеі | Людзі

1907 год — нарадзіўся (вёска Арэшкавічы, цяпер Пухавіцкі раён) Іосіф Іосіфавіч Жыновіч, беларускі цымбаліст, дырыжор, кампазітар, педагог, народны артыст Беларусі (1955), народны артыст СССР (1968). У 1944-74 гадах выкладаў у Беларускай кансерваторыі, дзе заснаваў клас цымбалаў і кафедру народных інструментаў. З 1946 года — мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Аркестра беларускіх народных інструментаў (з 2003-га Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Рэспублікі Беларусь носіць яго імя). Выканальніцкі стыль Жыновіча вылучаўся віртуозным бляскам, артыстызмам. Вялікая яго роля ў фарміраванні інструментальнага складу народнага аркестра, рэканструкцыі цымбалаў, стварэнні ўнікальнага рэпертуару. Сярод твораў: «Сказбыліна аб зямлі беларускай» для народнага аркестра, канцэртныя апрацоўкі народных песень і танцаў і інш. Памёр у 1974 годзе.

1954 год — 60 гадоў таму нарадзіўся (г. Мінск) Аляксандр Іванавіч Лучанок, беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук (2001). У 1975 годзе скончыў Беларускі інстытут народнай гаспадаркі. Працаваў у Мінску ў сферы прамысловай вытворчасці. З 1978 года — у Інстытуце эканомікі НАН Беларусі. Аўтар навуковых прац па праблемах макраэканамічнай і неаінстытуцыянальнай палітыкі, прадпрымальніцтва.

1955 год — у Варшаве падпісаны Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж Албаніяй, Балгарыяй, Венгрыяй, ГДР, Польшчай, Румыніяй, СССР і Чэхаславакіяй. Арганізацыя Варшаўскага дагавора — ваенна-палітычны абарончы саюз еўрапейскіх сацыялістычных дзяржаў. Ён быў заключаны на 20 гадоў з аўтаматычным падаўжэннем на наступныя 10 гадоў для тых дзяржаў, якія не дэнансуюць дзеянне Дагавора за год да заканчэння гэтага тэрміну. Уступіў у сілу 5 чэрвеня 1955 пасля перадачы ратыфікацыйных грамат на захоўванне польскаму ўраду. Албанія з 1962 года ў рабоце органаў Варшаўскага дагавора не ўдзельнічала, у 1968 годзе абвясціла аб яго дэнансацыі. Варшаўскі дагавор быў заключаны ў адказ на ўтварэнне ў 1949 годзе блока НАТА і насіў абарончы характар. У сувязі з пераўтварэннямі ў СССР і іншых краінах Усходняй Еўропы ў сакавіку 1991 года дзяржавы — удзельніцы АВД скасавалі яе ваенныя структуры, а 1 ліпеня 1991-га падпісалі пратакол аб поўным спыненні дзеяння дагавора. Да таго часу савецкія войскі ўжо пакінулі Венгрыю і Чэхаславакію, а Усходняя Германія, аб'яднаўшыся з ФРГ, улілася ў НАТА. Да канца 1991 года канчаткова распаліся міждзяржаўныя структуры, якія раней увасаблялі сацыялістычную садружнасць.

■ Прыемная навіна

ЧАС ДЖАЗУ

Пяты раз у Салігорску пройдзе Міжнародны конкурс джазавай і эстраднай музыкі JAZZ-TIME -2014. Праграма разлічана на 3 дні — з 16 па 18 мая — і ўключае ў сябе праслухоўванні юных музыкантаў у намінацыях: «Саліст-інструменталіст. Фартэпіяна», «Саліст-інструменталіст», «Малы інструментальны ансамбль», «Інструментальны ансамбль» і «Аркестр». Прадугледжаны і дадатковыя мерапрыемствы: канцэрты прафесійных калектываў, майстар-класы, «круглыя сталы».

Дадам, што сёлета пашыраны ўзроставыя рамкі ўдзельнікаў. Уведзена новая юнацкая катэгорыя для навучэнцаў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Усяго ж на музычны форум збяруцца каля 400 выканаўцаў, у тым ліку 69 салістаў-інструменталістаў, 17 ансамбляў, 10 аркестраў. Акрамя юных музыкантаў з розных рэгіёнаў нашай краіны, чакаюцца госці з Масквы, Жукоўскага, Яраслаўля, Смаленска (Расія).

У журы — прадстаўнікі Расійскай Федэрацыі, Беларусі, Швецыі пад старшынствам заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Ткачэнкі. У яго рабоце прыме таксама ўдзел кампазітар, педагог, прафесар Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных Юрый Чугуноў. У межах праграмы адбудзецца яго аўтарскі вечар.

Добрую арганізацыю і відовішчнасць конкурсу пастаянна адзначаюць усе яго ўдзельнікі. Традыцыйна будуць створаны максімальна камфортныя ўмовы для пражывання юных канкурсантаў.

Кожную дэлегацыю суправаджаюць валанцёры — каля 70 педагогаў Салігорскай дзіцячай школы мастацтваў.

Зімовы сад гэтай установы на час конкурсу пераўтворыцца ў кавярню «Паўза» са стыльным інтэр'ерам і вялікім маніторам у цэнтры, дзе будзе весціся прамое ўключэнне з канцэртнай залы.

Як адзначыў **начальнік аддзела народнай творчасці, культурна-забаўляльнай дзейнасці і ўстаноў адукацыі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінаблвыканкама Яўген АСТАШОЎ,** у гэтага музычнага форуму некалькі мэтаў: папоўніць дэфіцыт зносін у галіне дзіцячай і юнацкай адукацыі і выканання, павысіць узровень выканаўчага майстэрства, абмяняцца вопытам, пасадзейнічаць развіццю культурных сувязяў, стварэнню міжнародных творчых праектаў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Организация **ЗАКУПИТ** в больших объемах
ОХЛАЖДЕННУЮ, ЗАМОРОЖЕННУЮ СВИНИНУ ДОРОГО.
у ИП и юр.лиц по безналичному расчету
ООО "Евроторг" УНП 101168731
8 (044) 7888 503

НАРОДЖАНЫЯ 14 мая

Асобы, якія валодаюць здольнасцю лёгка і хутка распазнаваць магчымасці як сучаснасці, так і будучыні. Яны смела адмаўляюцца ад традыцый, рашуча пускаюцца на эксперыменты ў сферы сваёй прафесійнай дзейнасці. Вялікае душэўнае напружанне суправаджае іх жыццёвы шлях, таму што гэтыя людзі нястомна шукаюць дасканаласці. Яны не адрозніваюцца асаблівай эмацыянальнасцю, а ў пытаннях духоўнасці застаюцца замкнутымі. Найбольш адукаваныя асобы з тых, хто нарадзіўся ў гэты дзень, успрымальныя да здаровай крытыкі і каштоўных парад. Для іх важна зразумець, што значна большага поспеху яны змогуць дасягнуць тады, калі побач з імі людзі будуць адчуваць сябе камфотна і ўпэўнена.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 5.09	21.04	15.55
Віцебск	— 4.53	20.59	16.06
Магілёў	— 4.59	20.54	15.55
Гомель	— 5.03	20.43	15.40
Гродна	— 5.26	21.18	15.52
Брэст	— 5.33	21.12	15.39

Месяц
Поўня ў 22.15.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны
Пр. *Ніны, Тамары, Ерамея, Ігната, Яфіма.*
К. *Марыі, Юстыны, Баніфата, Віктара, Мацея, Міхала.*

Фота Алеся ВАРАБЕЙАЙ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+16..+18°С	КІЕЎ	+19..+21°С	РЫГА	+3..+5°С
ВІЛЬНЮС	+16..+18°С	МАСКВА	+19..+21°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+10..+12°С

УСМІХНЕМСЯ

У краме на касе.
— Малады чалавек, 18 ёсць?
— Але я ж ліманад купляю!
— А я проста цікаўлюся. Я жанчына вольная.

Разам з падаражаннем гарэлкі незразумелым чынам выраслі ў цане паслугі сантэхнікаў і слесараў.

— Глядзіце, гэта відэа пра тое, як я праводжу свой дзень.
— Але ж гэта фота, дзе ты ляжыш на канапе!
— Не! Гэта відэа...

Патрабуецца 30-гадовая жанчына для здымак у рэкламе «Як у 50 выглядаць на 35!»

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by, (для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.836. Індэкс 63850. Зак. № 2000.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 13 мая 2014 года.